*А.У. Сівак*
*УА МДПУ імя І.П. Шамякіна (г. Мазыр)*

# НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ ЯК АДНЫ З ПАЗНАВАЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ, КРАЯЗНАЎЧЫХ АБ'ЕКТАЎ МАЗЫРШЧЫНЫ

На паўднёва-ўсходняй частцы беларускага Палесся, на правым узгорыстым беразе ракі Прыпяць, размешчаны горад Мазыр. Мазыр з'яўляецца цэнтрам раёна і горадам абласнога падпарадкавання. Мазырскі раён знаходзіцца на паўднёвым захадзе Гомельскай вобласці. Плошча яго складае 1,6 тысяч квадратных кіламетраў, насельніцтва – звыш 21 тысячы чалавек. Мяжуе з Ельскім, Нараўлянскім, Хойніцкім, Калінкавіцкім, Петрыкаўскім і Лельчыцкім раёнамі, налічвае адзін гарадскі і 10 сельскіх Саветаў [1, 19].

На тэрыторыі сучаснай Мазыршчыны навукоўцамі за два апошнія стагоддзі выяўлена і часткова абследавана больш трыццаці археалагічных помнікаў, да 300 курганоў, выяўлены найстаражытнейшыя паселішчы людзей у наваколлях вёсак *Лубня* (8–5 тыс. да н. э.), *Загорыны* (2–3 тыс. да н. э.), *Маісееўка* (3–2 тыс. да н. э.), *Ясянец* (канец 7 – пачатак 6 ст. да н. э.) [1, 21].

Большасць археалагічных помнікаў з'яўляюцца сведчаннем жыцця тут людзей у эпоху Кіеўскай Русі ў 7–12 стагоддзі. У гэты перыяд Мазыршчына ўваходзіла ў склад старажытнарускай дзяржавы з цэнтрам у горадзе Кіеве.

Яшчэ нядаўна ў Мазырскім раёне налічвалася звыш 100 населеных пунктаў. Непрадуманае ўмацаванне калгасаў і саўгасаў, канцэнтрацыя гаспадарчай дзейнасці ў іх цэнтрах, прызнанне неперспектыўнымі малых вёсак, ліквідацыя працоўных месцаў, школ, устаноў культуры дало масавае адсяленне насельніцтва, галоўным чынам моладзі. Зараз у 20 вёсках і мястэчках пражывае менш 25 чалавек у кожным, у пераважнай большасці гэта людзі пенсійнага ўзросту.

Шэсць вёсак Мазыршчыны былі ліквідаваны з-за прамысловага будаўніцтва нафтаперапрацоўчага заводу (*Міхалкі*, *Кустаўніца*) ці зліліся з Мазыром (*Бабры*, *Баравікі*, *Майская*, *Целепуны*). Былі створаны новыя пасяленні – *Крынічны*, *"Дружба"* і чыгуначная станцыя *Міхалкі* [2, 85].

У Мазырскім раёне налічваецца 10 сельскіх Саветаў: *Барбароўскі, Каменкаўскі, Козенскі, Крынічанскі, Махнавіцкі, Міхалкаўскі, Асавецкі, Прудкоўскі, Скрыгалаўскі, Слабадскі* з насельніцтвам – 21100 чалавек [1, 19].

Шматлікія вёскі Мазырскага раёна зваліся раней сялібамі, ваколіцамі, дварамі, засценкамі, мястэчкамі, былі нават чыгуначныя раз'езды сялібамі лічыліся цяперашнія вёскі: *Бярозаўка, Гостаў, Зялёнка,*

МГПУ им. И.П.Шамякина

*Млынок, Свірынаўка, Дразды, Козенкі, Раеўскія, Бабры, Лапці, Целепуны, Лубня, Падлядзічы, Зімовая Буда, Гіневічаў Груд, Ясянец* і інш.; адносіліся да ваколіц: *Нароўшчызна, Пянькі, Тварычаўка*; да фальваркаў: *Чырвоная Горка* (да 1930 г. звалася *Вараб'ёўка*), *Балажэвічы, Стрэльск, Ляхаўцы*; чыгуначны прыпынак *Зялёны Бор*; мелі статус мястэчка вёскі *Барбароў, Мялешкавічы* (першапачаткова зваліся сялом), *Скрыгалаў* і інш., а вёска *Міцькі* першапачаткова называлася ваколіцай, засценкам, маёнткам. Зараз засталіся толькі такія назвы, як горад, вёска, сяло, мястэчка, станцыя і вельмі рэдка – сяліба [2, 86–122].

Мелі іншыя назвы ў мінулым наступныя вёскі: *Барбароў – Бабічы*; *Горная –Петрапаўлаўская Слабада*, *Капліца*; *Вялікі Бокаў – Бокаўшчына*; *Васькаўка – Васількова*; *Каменка – Каменшчына*; *Лучажэвічы – Лычажэвічы*; *Раеўскія – Раенка*; *Барыскавічы – Барысаўшчына*; *Мерабель – Мерабеля*, *Мірабель – Мерабелі*; *Лешня – Лясная* [2, 86–122].

Па нацыянальным складзе жыхары гэтых вёсак складаліся пераважна з беларусаў, у некаторых населеных пунктах пераважалі прадстаўнікі польскага паходжання (*Кустаўніца, Пянькі, Нароўшчызна, Крушнікі, Крынічная Града* і інш.), сустракаліся яўрэі і часткова ўкраінцы і рускія, галоўным чынам перасяленцы [2, 86–122].

Назвы населеных пунктаў Мазыршчыны матывуюцца адпаведнымі апелятывамі, якія кваліфікуюць спецыфічныя іх рысы. Гэтыя назвы можна падзяліць на некалькі груп:

– тапонімы, якія называюць аб'екты, размешчаныя ў нізкіх месцах, і матывуюцца апелятывамі: *балота, роў, яма, канава, поле, ляда* і інш.: *Забалацце, Падлядзічы*;

– тапонімы, матываваныя назвамі мясцовага рэльефу: *Горная, Загорыны, Каменка, Пянькі* і інш.;

– тапонімы, звязаныя з батанічнымі назвамі (ляснымі масівамі, зараснікамі, пародамі дрэў, раслін, штучнымі пасадкамі): *Бярозаўка, Хваёвы, Чэрэмашня, Ясянец*;

– тапонімы, утвораныя ад гідралагічных назваў: *Крынічны, Крынічная Града, Прудок*.

тапонімы, суадносныя з уласнымі імёнамі, прозвішчамі ці мянушкамі, якія мелі першыя пасяленцы ці ўладальнікі такіх паселішчаў: *Барбароў, Барыскавічы, Васькаўка, Міхалкі, Раеўскія, Хамічкі* і інш.

Гістарычнае мінулае таксама накладвала свой пэўны адбітак на паходжанне геаграфічных назваў.

Вядома, што землямі ў пэўны гістарычны час валодалі буйныя паны-магнаты: Абуховічы, Бараноўскія, Франкоўскія, Абрамовічы, Аскеркі, Горваты, Шумскія, Кеневічы, Крукоўскія і інш [1, 47]. У *Слабадзе, Барбарове, Скрыгалаве, Балажэвічах* меліся невялікія заводы, была пабудавана вузкакалейка ад *Зялёнага Моху* да *Балажэвіч*, названая конкай. Дзейнічала верф для будаўніцтва непаравых суднаў, шпулетакарны завод,

МГПУ им. И.П.Шамякина

які выпускаў прадукцыю сусветнага значэння, знаходзілася цагельня ў вёсцы *Лешня*.

У гады Вялікай Айчыннай вайны нямецкія захопнікі на тэрыторыі раёна цалкам спалілі 36 населеных пунктаў. Тры вёскі (*Казіміраўка, Касцюковічы, Буда-Казіміраўская*) былі знішчаны разам з жыхарамі.

У савецкі час з'явіліся новыя пасяленні: *Перадавы, Прагрэс, Новая Ніва, Хваёвы*.

На тэрыторыі сучаснага раёна 58 помнікаў, абеліскаў і мемарыяльных дошак па гісторыі і культуры раёна, больш за 30 помнікаў археалогіі, архітэктуры, прыроды і сядзібна-паркавага мастацтва [1, 19].

Такім чынам, паселішчы Мазыршчыны з'яўляюцца значнымі тапанімічнымі аб'ектамі пазнання матэрыяльна-духоўнай культуры, багатага краязнаўчага матэрыялу, якія знаёмяць з унікальнай прыродай, народнымі традыцыямі, звычаямі, гістарычным мінулым і сучасным палескага краю і з'яўляюцца прыярытэтнымі для развіцця розных відаў сучаснага мясцовага турызму.

**Літаратура**

1. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Мазыра і Мазырск. р-на / склад. М.А. Капач, В.Р. Феранц. – Мінск: Маст. літ., 1997. –574 с.

2. Марцэлеў, С.В. Гарады і вёскі Беларусі / С.В. Марцэлеў // Гомельская вобласць: энцыкл.: у 2 т.; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш/]. – Мінск: БелЭн, 2005. – Т. 2. – 520 с.

3. Копач, М. Деревни и люди Мозырщины: Историко-документальная хроника Мозырского района, всех Сельских Советов и населённых пунктов региона / М. Копач. – Мозырь: КПУП "Колор", 2001. – 152 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина